# ГАНЧАРСТВА НА ТЭРЫТОРЫІ СТОЛІНСКАГА РАЁНА

**Гмір Г. М.**

Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь
Навуковы кіраўнік – Сняжыцкая А. С.

Мэта дадзенай працы – даведацца аб станаўленні ганчарства на тэрыторыі Столінскага раёна, гістарычных умовах яго развіцця, значэнні для жыхароў Століншчыны.

Сучасныя жыхары і сельскай мясцовасці, і гарадское насельніцтва актыўна выкарыстоўваюць ў штодзённым жыцці сучасныя ганчарныя вырабы, але мала хто задумваецца аб часе яго з'яўлення і распаўсюджвання сярод насельніцтва і купцоў на старажытнай тэрыторыі нашай краіны.

Радзімай ганчарнага вырабу на тэрыторыі Беларусі прынята лічыць вёску Гарадная, якая знаходзіцца ў Столінскім раёне. Па павер'і мясцовых жыхароў, гэта рамяство ўзнікла тут, калі адзін з вяскоўцаў выпадкова знайшоў залежы гліны. Пласты яе залягання, як высветлілася пазней, дасягаюць больш за 20 метраў пад зямлёй. Гліна на гэтай тэрыторыі розная: чорная, чырвоная, шэрая і белая. Ва ўмелых руках майстроў яна ператваралася ў сапраўдныя творы мастацтва, якія мелі сваю каштоўнасць [1].

Вёска Гарадная, як і амаль усе вёскі таго часу, не была актыўна развітым населеным пунктам, аднак гліна дапамагла простаму народу не толькі ў вырабе посуду для сваіх сем'яў, але і ў дасягненні пэўных мэт па развіцці ўласнай зямлі-маці.

Практычна ў кожнай хаце, у кожнай сям'і вырабляўся гліняны посуд. Старыя і моладзь вучылі дзяцей гатаму занятку, што лічылася абавязковым сімвалам у станаўленні сапраўднага жыхара вёскі. Ёсць меркаванне, што сапраўдным мужчынам лічыўся толькі той, хто ўмеў рабіць гліняны посуд. А таксама дзяўчаты выбіралі жаніхоў па тым, як умела хлопцы маглі яго вырабляць.

Першапачаткова посуд з гліны рабіўся выключна для асабістага выкарыстання. Але паколькі ў іншых навакольных вёсках ганчарствам ніхто не займаўся, а разнастайнасць форм, памераў і колькасць выробленых гаршкоў у Гараднй павялічвалася, гэта дапамагло наладзіць знешні гандаль. Попыт на чыгуны распаўсюджваўся далёка за межы вёскі, на адлегласць больш за некалькі сотняў кіламетраў. Забяспечваючы посудам частку насельніцтва, гарадзенцы атрымлівалі збожжа для выпечкі хлеба. Таксама менавіта ганчарства дапамагала насельніцтву вёскі ў пасляваенны час не памерці з голаду. Калі панавала разруха і паўсюдная беднасць, попыт на чыгуны пачаў ізноў узрастаць, паколькі ў той час ніякага посуду практычна не засталося.

Некаторыя гісторыкі нават лічылі, што менавіта дзякуючы шырокаму развіццю і распаўсюджванню гарадзенскіх тавараў з гліны, вёска атрымала



Рэпазіторый ГрДМУ

Магдэбургскае права ў 1579 годзе граматай Стэфана Баторыя. Гэта і дазволіла жыхарам свабодна займацца і ўдасканальваць сваё рамяство [2].

У цяперашні час выкарыстанне глінянага посуду для мясцовага насельніцтва ўжо не так актуальна, як раней, аднак ён, безумоўна, мае велізарнае значэнне ў станаўленні вёскі Гарадная. Менавіта таму ў 2003 годзе на тэрыторыі населенага пункта быў адкрыты адзіны Цэнтр ганчарства, у якім кожны жадаючы мае магчымасць не толькі дакрануцца да творчасці майстроў, але і пазнаёміцца з некаторымі ганчарамі асабіста, паглядзець на працэс стварэння некаторых відаў вырабаў і паўдзельнічаць у гэтым. Кожныя два гады ў Гараднoй праводзяцца міжнародныя плэнеры ганчароў, куды прыязджаюць майстры не толькі з усёй Беларусі, але і з іншых краін: Расіі, Грузіі, Малдовы, Літвы і Латвіі [3]. Недалёка ад лесу ў Новым Пасёлку да гэтага часу стаіць старажытная печ, у якой калісьці нашы продкі падрыхтоўвалі гліну для далейшай лепкі. Амаль да сярэдзіне 90-х гадоў XX ст. некаторыя майстры працягвалі рыхтаваць там гліну. Любы жадаючы можа ўбачыць на свае вочы, у якіх менавіта печах выраблялася гліна ў старажытны час. Гэтай печы ўжо шмат гадоў, і ёй ніхто не карыстаецца зараз, але для жыхароў – гэта памяць і каштоўнасць. Таксама на ўездзе ў вёску стаіць стэла, на якой знаходзяцца некалькі гліняных збаноў як сімвал гэтай зямлі. Такім чынам, дадзены від рамяства дазволіў вёсцы атрымаць заслужанае прызнанне не толькі ў сучаснасці, але і дапамог ў далёкім мінулым.

Літаратура:

1. У Гараднoй праходзіць міжнародны пленэр ганчароў. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://virtualbrest.ru/news5601.php. – Дата доступу: 05.10.2024.

2. Вячорка, Г. Ф. Гарадзенскае ганчарства: мінулае і сучаснасць (абноўлена) [Электронны рэсурс] / Г. Ф. Вячорка. – Рэжым доступу: https://horodno.blogspot.com/2015/07/haradenskaje-hancarstva_10.html. – Дата доступу: 05.10.2024

3. Бяроза, П. Міжнародны плэнер ганчароў праходзіць у Столінскім раёне [Электронны рэсурс] / П. Бяроза. – Рэжым доступу: https://1pr.by/2024/07/mezhdunarodnyj-plenjer-goncharov-prohodit-v-stolinskom-rajone/. – Дата доступу: 05.10.2024.

## ПУТЕШЕСТВИЕ ПО ВОЛКОВЫССКОМУ РАЙОНУ С В. КАРПЫЗОЙ (СОЗДАВАЯ ТУРИСТИЧЕСКИЙ МАРШРУТ)

**Гресь Л. С.**

Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Республика Беларусь
Научный руководитель – канд. ист. наук, доц. Гресь С. М.

В истории Беларуси современный Волковысский район занимает достаточно весомое место. Однако как место туристического отдыха пока его позиции не настолько серьезны. Поэтому основная цель данной работы



Репозиторий ГрГМУ